Тэалагічны інстытут хрысціян веры евангельскай (г. Мінск)

Мінская багаслоўская семінарыя
Саюза евангельскіх хрысціян баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь

# Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць

## Выпуск 4

(да 100-годдзя
Вялікага евангельскага прабуджэння ў Беларусі)

Зборнік матэрыялаў
IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
(Мінск, 7 снежня 2019 г.)

Мінск
«Пазітыў-цэнтр»
2021

УДК [279.123+274/278]–9(476)(082)
ББК 86.376(4Беи)я43
Е 13

**Укладальнікі:**
А.І. Бокун, А.У. Унучак, Ю.А. Бачышча

**Рэдакцыйная калегія:**
П.І. Асененка, Ю.А. Бачышча, А.І. Бокун, Л.І. Міховіч, С.С. Паднюк, А.У. Унучак, Р.В. Шапялевіч

**Рэцэнзенты:**
кандыдат гістарычных навук В.С. Макарэвіч,
кандыдат гістарычных навук А.В. Пашкевіч

Е13 **Евангельская Царква Беларусі:** гісторыя і сучаснасць. Вып. 4 : (да 100-годдзя Вялікага евангельскага прабуджэння ў Беларусі) : зборнік матэрыялаў IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 7 снежня 2019 г.) / уклад.: А.І. Бокун, А.У. Унучак, Ю.А. Бачышча . — Мінск : Пазітыў-цэнтр, 2021. – 448 с .: іл.
ISBN 978-985-7193-65-3.

Зборнік прысвечаны 100-годдзю Вялікага евангельскага прабуджэння ў Беларусі, якое адбывалася ў 1920-1930-я гг. Увазе чытача прадстаўлены артыкулы беларускіх і замежных аўтараў, у якіх адлюстраваны розныя аспекты гісторыі Вялікага евангельскага прабуджэння ў Беларусі, уклад пратэстантаў у развіццё беларускай культуры, а таксама іншыя важныя старонкі гісторыі беларускага пратэстантызму пачынаючы ад XVI ст. і заканчваючы XXI ст.

Для тых хто цікавіцца гісторыяй Евангельскай Царквы Беларусі і канфесійнай гісторыяй нашай краіны.

**УДК [279.123+274/278]-9(476)(082)**
**ББК 86.376(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-7193-65-3**

© Мінская багаслоўская семінарыя Саюза евангельскіх хрысціян баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь, 2021
© Афармленне. ПВУП «Пазітыў-цэнтр», 2021

*Уладзімір Казлоў.* Станіслаў Нядзьвецкі: новыя факты генеалогіі і біяграфіі……………………………………... 230
*Андрусь Каск.* Джон Віт і мэтадысты…………………… 237
*Алена Глагоўская.* Вялікае эвангельскае прабуджэньне ў 1920-я гг. у Заходняй Беларусі (па матэрыялах пэрыядычных выданьняў “Słowo Prawdy” і “Маяк”)….. 254
*Павел Асененка.* “Залатое дзесяцігоддзе” ў гісторыі Евангельскай Царквы ва Усходняй Беларусі (1917 – 1929 гг.)…………………………………………………… 281
*Таццяна Лісоўская.* Месца і роля евангельскага руху ў канфесійным жыцці Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) 286
*Уладзімір Чынікайла.* Вялікае евангельскае прабуджэнне 1920-х – 1930-х гг. на Століншчыне…….. 309
*Яўген Сергіеня.* Гісторыя Чудзінскай царквы ХВЕ Ганцавіцкага раёна (паводле ўспамінаў вернікаў)……... 314
*Таццяна Касатая.* Моладзь у беларускіх евангельскіх цэрквах у 1940-я – 1980-я гг………………………….. 323
*Сяргей Верамееў.* Пратэстанты Гомеля ў 1950-я гг……. 334
*Леанід Міхові.* Набажэнства як сродак эвангелізацыі ў цэрквах эвангельскіх хрысьціян баптыстаў Беларусі….. 345
*Юрась Бачышча.* Духоўная спадчына Артура Вольскага………………………………………………… 361
*Сяргей Паднюк.* Заснаванне і дзейнасць аб’яднання хрысціян веры евангельскай у Беларусі………………… 382
*Дзяніс Правазораў, Валерый Шэйбак.* Цэрквы хрысціян поўнага Евангелля ў Беларусі…………………………… 397
*Юрась Гецэвіч, Яўгенія Зяноўка, Эвеліна Русецкая, Зміцер Дзенісюк, Анастасія Драгун, Андрусь Бакуновіч, Павал Гусьціновіч.* Рэалізацыя бесперапыннай даступнасці гісторыка-культурных экспанатаў выставы «Беларусь і Біблія» з дапамогай аўдыягідаў…………… 404
*Ганна Станіславенка.* Міжнародная выстава “Беларусь і Біблія” ў інфармацыйнай прасторы Беларусі ……….. 413
*Максім Стасілевіч.* Экспедыцыя па зборы ўспамінаў вернікаў-пратэстантаў Стаўбцоўскага і Нясвіжскага раёнаў (11-13 чэрвеня 2019 г.): планы і вынікі………… 422
Заключнае слова…………………………………………. 428
Зьвесткі пра аўтараў……………………………………... 430



# CONTENTS

Introduction……………………………………………… 7
*Antoni Bokun.* The Great Evangelical Revival in Belarus (1920s – 1930s)………………………………………. 10
*Liudmila Ivanova.* Churches in the possessions of Jan Kishka………………………………………………… 30
*Yury Bachyshcha.* Reformation intentions in the activities of the Chancellor of the Grand Duchy of Lithuania Astafei Valovich……………………………………………… 38
*Bruce L. Anderson.* “Oratio funebris in laudem Ioannis Abramovicj” (1602) and the Relationship between Andrej Molan and Jan Abramowich: An Example of the Depth of the Reformed Movement in the Grand Duchy of Lithuania.. 52
*Dmitry Zhuk.* The contribution of the Reformation to the development of the legislation of the Grand Duchy of Lithuania (second half of the XVI century)……………….. 88
*Ihar Bortnik.* Social and political ideas in the early XVII century in work “Pobożnego ewangelika do braciej tegoż wyznania narodu polskiego i litewskiego przestroga i napomnieinie” 105
*Andrei Samusik.* Educational and instructional activity of John Amos Comenius in the context of the development of education in Belarus (the XVII – the middle of the XVIII centuries)……………………………………………… 122
*Yury Snapkouski.* The Calvinist Mikalaj Mandelshtam as President of Mahiliou Association of Doctors and the founder of district medicine in Belarus…………………… 132
*Andrus Unuchak.* Governmental policy of the Russian Empire towards the Evangelical Christians of Belarus during World War I (1914 – 1917)………………………… 168
*Jan Mironczuk.* Evangelical movement in Białystok and Bielsk counties (1918 – 1939)……………………………... 187
*Uladzimir Rusetski.* The Great Evangelical Revival of the 1920s and 1930s in Western Belarus: distinctive features and ways of evangelization………………………………… 202
*Siarhei Jarmaluk.* Pastor Sciapan Jarmaluk: life and ministry (based on oral history materials)…………………. 216

Юрась ГЕЦЭВІЧ, Яўгенія ЗЯНОЎКА,
Эвеліна РУСЕЦКАЯ, Зьміцер ДЗЕНІСЮК,
Анастасія ДРАГУН, Андрусь БАКУНОВІЧ,
Павал ГУСЬЦІНОВІЧ

# Рэалізацыя бесьперапыннай даступнасьці гісторыка-культурных экспанатаў выставы "Беларусь і Біблія" з дапамогай аўдыягідаў

У 2018 г. у Менску прайшла выстава "Беларусь і Біблія". Яна адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў Музэі кнігі[1]. На працягу пэрыяду з 20 верасьня да 21 кастрычніка 2018 г. больш за 30 000 чалавек змаглі пазнаёміцца з экспанатамі выставы. Для дадатковага зручнага ўспрыняцьця інфармацыі пра экспанаты на выставе, былі распрацаваныя спэцыяльныя аўдыягіды для наведвальнікаў. Разгледзім перадгісторыю распрацоўкі і асаблівасьці рэалізацыі праграмных сродкаў аўдыягідаў, якія і да гэтага часу дазваляюць любому ахвотнаму пазнаёміцца з экспанатамі выставы ў віртуальным асяродзьдзі.

### *Пастаноўка задач*

За 6 месяцаў да міжнароднай выставы "Беларусь і Біблія" адбыліся папярэднія перамовы паміж доктарам (PhD) Скотам Кэралам, дырэктарам арганізацыі "Група даследаваньня рукапісаў"[2] (ЗША) і прадстаўнікамі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пра тое, як будзе працаваць выстава. Агулам на выставе плянавалася прадставіць экспанаты з розных краінаў — Беларусі,

[1] Электронны рэсурс: https://news.tut.by/culture/608615.html "От некоторых сумм у таможенников округлялись глаза". В Минск привезли экспонаты на миллионы евро.

[2] Электронны рэсурс: https://www.inspiredexhibit.org/. INSPIRED Exhibit



ЗША, Кітаю, Егіпту, Ізраіля, Вялікабрытаніі і інш. У ходзе абмеркаваньня ўзьнікла ідэя зрабіць так, каб падчас выставы і пасьля яе экспанаты былі даступныя праз сродкі інтэрнэту, у тым ліку і праз мабільныя тэлефоны.

Былі абазначаны наступныя задачы для распрацоўкі праграмнага забесьпячэньня і спадарожных візуальных сродкаў па бесьперапыннай папулярызацыі экспанатаў выставы "Беларусь і Біблія":

– Дапамагчы наведвальнікам пабачыць і пачуць дэталёвую інфармацыю пра вялікую колькасьць экспанатаў;

– Даць магчымасьць наведаць выставу ў віртуальным туры;

– Прадставіць агучаныя вэрсіі экспанатаў выставы на 3 мовах: беларускай, ангельскай і расейскай;

– "Разгрузіць" экскурсаводаў, бо наведвальнікаў можа быць ад некалькіх соцень да некалькіх тысяч на дзень;

– Зрабіць, каб экспанаты былы даступнымі і пасьля закрыцьця выставы;

– Распрацаваць камплекты рэклямнага банэра і раздаткавых фляераў пра дыягіды.

### *Апісаньне распрацаванага рашэньня*

На працягу 2 месяцаў вялася распрацоўка праграмных рашэньняў на аснове кантэнтных матэрыялаў (тэкст, выявы) прадстаўленых арганізатарамі выставы. Яшчэ 2 месяцы, адбывалася тэставаньне і ўкараненьне сыстэмаў і спадарожных візуальных сродкаў па бесьперапыннай папулярызацыі экспанатаў выставы "Беларусь і Біблія".

Праграмная распрацоўка аўдыягідаў была ажыцьцёўлена ў лябараторыі распазнаваньня і сынтэзу маўленьня Аб'яднанага інстытута праблемаў інфарматыкі НАН Беларусі[3]. аўдыяпаведамленьні пра экспанаты начыталі па тэкстах, якія былі правераны і скарэткаваны экспэртамі з Інстытуту гісторыі НАН Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

[3] Электронны рэсурс: https://ssrlab.by/ — Лабараторыя распазнавання і сінтэзу маўлення АІПІ НАН Беларусі.

Праграмныя рашэньні аўдыягідаў былі апублікаваныя на электронных пляцоўках для агульнага карыстаньня Google Play Market і ў App Store з назвай “Belarus and the Bible”. Спасылкі на электронныя пляцоўкі зьмясьцілі на агульны партал http://krokam.by/belarus-bible. Там зьмешчаны 3 распрацаваныя вэрсіі аўдыягіду: вэб-сайт, Android-праграма, iOs-праграма (Мал. 1). Кожная вэрсія аўдыягіду падтрымлівае беларускую, ангельскую і расейскую мовы. На дадзены момант у кожнай вэрсіі аўдыягіду даступныя 153 экспанаты выставы.




Мал. 1. Уваходная старонка аўдыягідаў “Беларусь і Біблія” для вэб-плятформ http://krokam.by/belarus-bible

Разгледзім, як працуе аўдыягід. Калі ён актываваны карыстальнікам, то пры першай загрузцы можна абраць неабходную мову інтэрфэйсу. Далей аўдыягід выдасьць сьпіс усіх сэкцый экспанатаў, іх агульная колькасьць — 14 (Мал. 2, 3). Калі абраць канкрэтную сэкцыю, то аўдыягід выдасьць сьпіс экспанатаў гэтай сэкцыі. Напрыклад, “Сэкцыя 3. РУКАПІСЫ ЭПОХІ НОВАГА ЗАПАВЕТУ” ўключае экспанаты ад “Экспанат 16 Папірус P52 (Эвангельле паводле Яна 18: 31-33, 37-38)” да “Экспанат 22 Амулет з імёнамі Бога і выявай Выхаду”.





Мал. 2. Інтэрфэйс мабільнай вэрсіі аўдыягіду “Беларусь і Біблія” для Android



Мал. 3. Інтэрфейс мабільнай версіі аўдыягіда “Беларусь і Біблія” пад iOS

Калі абраць канкрэтны экспанат, то аўдыягід выдасьць электронную картку экспаната з парадкавым (скразным) нумарам, назвай, месцам знаходжаньня і выявай экспаната, гукавое паведамленьне пра экспанат і яго тэкставае апісаньне. Напрыклад, экспанат “Папірус Бадмэра” мае тэкставае апісаньне: *“Папірус Бадмэра. Пасланьні Апостала Пятра. III стагодзьдзе. Адзін з найстаражытнейшых тэкстаў кніг Новага Запавету на грэцкай мове на папірусе...”.* Пры актывацыі гукавога плэера ў адкрытай картцы экспанату па клявішы ў выглядзе чырвонага

трохкутніка карыстальнік можа праслухаць гукавое паведамленьне пра экспанат.

Заўважым, што да кожнага аб'екту на выставе была дададзеная этыкетка з абазначаным скразным нумарам ад 1 да 153, назвай і кароткім апісаньнем. Гэтыя нумары супадалі з нумарамі электронных картак экспанатаў у аўдыягідзе (Мал. 4). Дзякуючы гэтаму карыстальнік можа свабодна арыентавацца ў экспанатах выставы, зьмяняць пасьлядоўнасьць успрыняцьця экспанатаў, рабіць уласныя нататкі па ходзе прагляду экспанатаў з пазнакай нумару экспаната. Таксама па нумары экспанат можна было знайсьці ў каталёгу выставы на беларускай[4], расейскай ці ангельскай мовах, дзе прыводзіцца разгорнутае апісаньне экспанатаў і пашыраныя ўводзіны да кожнай сэкцыі выставы.




Мал. 4. Прынцып адпаведнасьці нумароў экспанатаў на вітрынах і нумароў электронных картках экспанатаў у аўдыягідзе.

Таксама для аўдыягіду па выставе "Беларусь і Біблія" быў распрацаваны і надрукаваны рэклямны банэр памерам 202x85 см. Банэр запрашаў наведвальніка скарыстацца прапанаваным аўдыягідам праз QR-код і дадаткова папулярызаваў прысутнасьць выставы ў бібліятэцы. Акрамя таго, былі распрацаваныя,

[4] Беларусь і Біблія : Міжнародная выстава (Мінск, 20 верасня – 21 кастрычніка 2018 года) : каталог. Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Група даследавання рукапісаў; пад агульнай рэдакцыяй Алеся Сушы і Скота Кэрала. Мінск, 2018.



выраблены і раздадзеныя 6000 двухбаковых эўрафляераў з тэкстам на беларускай і ангельскай мовах для зручнасьці знаёмства наведвальнікаў з аўдыягідамі выставы (Мал. 5). Такім чынам вырашылі пытаньне даступнасьці інфармацыі пра аўдыягіды: беларусам — па-беларуску, а наведвальнікам, якія не разумеюць беларускай — па-ангельску.




Мал. 5. Выгляд флаераў для зручнасьці знаёмства наведвальнікаў з аўдыягідамі па выставе.

### *Апрабацыя распрацаванага рашэньня*

Пасьля ўкараненьня і тэставаньня распрацаваных аўдыягідаў падчас работы выставы былі сабраныя водгукі розных карыстальнікаў. У цэлым гэта былі станоўчыя водгукі з пажаданьнямі дадаць стабільнасьці работы распрацаванаму функцыяналу аўдыягідаў.

Супрацоўнікі Музэю кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адзначылі, што аўдыягіды дазволілі ім лепш рыхтавацца да патэнцыйных пытаньняў ад наведвальнікаў. Доктар Скот Кэрал застаўся вельмі задаволены, што зьявілася магчымасьць пабачыць усе біблійныя артэфакты ў адной электроннай прасторы аўдыягідаў. Ён казаў, што ў яго сотні, а то і тысячы розных электронных файлаў, але так, каб быў адзіны сьпіс, — гэта адбылося першы раз.

Наведвальнікі выставы адзначалі, што ім падабаецца карыстацца аўдыягідамі, бо ў іх зьявілася магчымасьць

успрымаць экспанаты не пасьлядоўна, а выбарачна, але аднолькава якасна як і са звычайнымі экскурсаводамі, якія былі хаця б часткова, але "разгружаныя", бо бачылі, што прыходзілі наведвальнікі, якія самі маглі прайсьці маршрут, а ў канцы задаць удакладняльныя пытаньні.

Пасля прагляду статыстыкі з электронных пляцовак было ўстаноўлена, што геаграфія карыстальнікаў аўдыягідаў у асноўным зводзііцца да трох краінаў: Беларусь, Злучаныя Штаты Амэрыкі і Расея. На малюнку 6 бачныя прыклады зваротаў да аб'ектаў выставы праз аўдыягіды. Карыстальнікі слухалі пра вялікі сувой Ісаі, пра грэцкі папірус з тэкстам Першага пасланьня да Карынфянаў, пра Берасьцейскую, або Радзівілаўскую, Біблію і інш.




| Requests | Resource | Last time |
|---|---|---|
| 1 | Вялікі Сувой Ісаі [Частка 2] [be] | 2019-12-05 11:22 |
| 1 | Грэчаскі папірус з тэкстам з 1-га Пасланьня да Карынфянаў [Частка 3] [be] | 2019-12-01 12:59 |
| 1 | Працы Трыдэнцкага сабора [Частка 7] [be] | 2019-12-06 12:39 |
| 1 | Брэсцкая, або Радзівілаўская Біблія [Частка 13] [be] | 2019-12-05 10:55 |
| 1 | Адна піктаграфічная і дзве клінапісныя таблічкі [Частка 1] [be] | 2019-12-06 09:09 |
| 1 | Сувой Мёртвага мора 4Q162 (4Qpisab) – Пешэр Ісаі [Частка 2] [be] | 2019-12-05 11:21 |
| 1 | Сувой Мёртвага мора 4Q109 (4QQoha) – Кэалет (Эклезіяст) [Частка 2] [ru] | 2019-12-04 21:26 |
| 1 | Сувой Мёртвага мора 4Q175 – Тэстымоніа, або Месіянскі зборнік [Частка 2] [be] | 2019-12-05 11:21 |
| 1 | Першая кніга Эноха на грэчаскай мове з папірусаў Чэстэра Біці [Частка 2] [be] | 2019-12-05 11:21 |
| 1 | Першая кніга Эноха на грэчаскай мове з папірусаў Чэстэра Біці [Частка 2] [ru] | 2019-12-04 21:26 |

Мал. 6. Прыклады запытаў да вэб-аўдыягіда па выставе "Беларусь і Біблія".

Калі прааналізаваць статыстыку спампоўваньня мабільных дадаткаў, то статыстыка "адыходаў" ад карыстаньня мабільным дадаткам найлепш адлюстроўвае рэальнасьць. Найчасьцей карыстальнік паставіў сабе аўдыягід на тэлефон, карыстаўся ім пэўны час, а пасьля выдаліў. Колькасьць спампоўваньняў на піку даходзіла да 400 ці нават да 500, што вельмі добра. Пазьней аўдыягіды з часам выдаляліся, як, у прынцыпе, любы іншы дадатак да мабільнага тэлефона, таму што памяць, у тым ліку ўнутраная флэш-памяць, пастаянна запаўняецца дадзенымі з розных дадаткаў мабільнага тэлефона.



Пасьля таго як выстава скончыла сваю працу, былі перафатаграфаваныя вітрыны экспанатаў, зьнятае відэа перад дэмантажом выставы, каб і пасьля выставы можна было пабачыць, як экспанаты выглядаюць у рэальнасьці. Каб атрымаць доступ да фотаздымкаў і відэа, патрэбна зайсьці на старонку аўдыягідаў https://krokam.by/belarus-bible, абраць пункт мэню "Галерэя – Фотаздымкі" ці "Галерэя – Відэа".

### *Заключэньне і далейшыя планы*

Такім чынам, была рэалізавана задача арганізацыі бесьперапыннай дасупнасьці да экспанатаў выставы "Беларусь і Біблія" з дапамогай аўдыягідаў. Калі адзначыць самае галоўнае, то першае, што ўдалося — гэта зрабіць выставу больш даступнай для наведвальнікаў. Таксама выстава была папулярызавана ў інтэрнэце. І нарэшце, распрацавана опцыя, якая дазваляе знаёміцца з экспанатамі выставы пастаянна.

Што датычыць жывой камунікацыі, то можна напісаць Скоту Кэралу (scott.carroll@inspiredexhibit.org) і задаць пытаньні па экспанатах выставы. Таксама магчыма прыйсьці ў Музэй кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і паглядзець тыя экспанаты, якія былі ўзятыя з бібліятэчных фондаў. Напрыклад, факсымільнае выданьне біблійных перакладаў Скарыны ці калекцыя беларускіх перакладаў Бібліі XX ст.

У плянах разьвіцьця заяўленай тэмы можна вылучыць наступнае:

– Стварэньне мультымэдыя-рэсурсаў пра гісторыка-культурныя аб'екты беларускіх мясьцін, якія зьвязаныя з Бібліяй;

– Распрацоўка аўдыягідаў гісторыка-культурнай экскурсіі "Брэст — горад Бібліі";

– Падрыхтоўка аўдыягідаў для краязнаўчых музэяў Беларусі, збор і папулярызацыя інфармацыі пра біблійныя экспанаты ў пастаянных экспазыцыях гэтых музэяў;

– Працяг супрацы з некамэрцыйнай арганізацыяй "Групы дасьледаваньня рукапісаў" (Manuscript Research Group, ЗША) падчас стварэньня выставаў рукапісаў і біблійных старадрукаў.

## SUMMARY


*Yuras Hetsevich, Yauheniya Zianouka,*
*Evelina Rusetskaya, Zmicier Dzienisiuk,*
*Anastasija Drahun, Andrus Bakunovic,*
*Pavel Huscinovich*


### Implementation of continuous availability of historical and cultural pieces of the exhibition *Belarus and the Bible* with the help of audio guides


In 2018, Belarus hosted *Belarus and the Bible* exhibition. It was held in the National Library of Belarus in the Book Museum. During the period from September 20 to October 21, 2018, more than 30,000 people were able to get acquainted with the pieces of the exhibition. For additional convenient perception of historical and cultural exhibits, special audio guides for visitors for Android, iOS, and web browsers were developed. Audio guides provide continuous delivery of text, graphics and audio materials about the pieces of the exhibition at the link https://krokam.by/belarus-bible.